# Барысаў — культурная сталіца Беларусі

**Асаблівае месца сярод беларускіх гарадоў з багатым гістарычным мінулым займае Барысаў, які цікавы ўсім, хто ведае і любіць еўрапейскую гісторыю, архітэктуру і культуру.**

Горад даў Беларусі і свету шмат вядомых прозвішчаў. Знакавай фігурай з'яўляецца Іван Каладзееў — вядомы ў Беларусі бібліяфіл і землеўладальнік, калекцыянер і мецэнат канца XIX — пачатку XX ст.

Будучы міністр замежных спраў СССР Андрэй Грамыка вучыўся ў Барысаўскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Ураджэнцы горада — народны мастак Беларусі Анатоль Анікейчык і заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Валерый Шкаруба, творчасць якіх атрымала сусветную вядомасць. Значны ўнёсак у развіццё музычнага мастацтва Беларусі зрабілі кампазітар Рычард Бутвілоўскі, дырыжор узорна-паказальнага аркестра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Аляксандр Фёдараў. Прызнанымі майстрамі тэатральнай сцэны сталі народная артыстка СССР Наталля Бурмістрава і заслужаны артыст Беларусі, дыктар беларускага радыё Ілья Курган. Літаратурныя традыцыі падтрымлівалі ў горадзе такія пісьменнікі і паэты, як Янка Купала, Васіль Зуёнак, Сяргей Законнікаў, Алесь Ставер, Мікола Мятліцкі, Генрых Далідовіч і інш. У сувязі з атрыманнем Барысавам ганаровага статусу «Культурная сталіца Беларусі 2021 года» на працягу ўсяго года запланаваны рэспубліканскія і рэгіянальныя творчыя праекты, будуць праведзены акцыі, форумы, многія іншыя мерапрыемствы. Гораду на Бярэзіне ёсць пра што расказаць і ёсць што паказаць гасцям.



*Фота з сайта krynica.info*

У бюлетэні «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку, які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, змешчаны бібліяграфічны спіс «Барысаў — культурная сталіца Беларусі 2021 года». Прадстаўлены матэрыял уключае звесткі пра ўзнікненне, развіццё, архітэктурныя асаблівасці, багатую культурную спадчыну старажытнага горада. Спіс складаецца з наступных раздзелаў: «Гісторыя горада на Бярэзіне», «Гісторыка-культурная спадчына горада», «Барысаў прамысловы», «Культурнае жыццё горада». Усе раздзелы суправаджаюцца невялікімі нарысамі. Некаторыя бібліяграфічныя апісанні крыніц дапоўнены анатацыямі, што дазваляе лёгка арыентавацца ў інфармацыі.

**Кацярына ВАРАНЬКО**